View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk

brought to you by CORE

МИНИСТЕРСТВО ЗДРАВООХРАНЕНИЯ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

УО «ВИТЕБСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ
ОРДЕНА ДРУЖБЫ НАРОДОВ МЕДИЦИНСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ»

# ДОСТИЖЕНИЯ ФУНДАМЕНТАЛЬНОЙ, КЛИНИЧЕСКОЙ МЕДИЦИНЫ И ФАРМАЦИИ

Материалы 69-ой научной сессии сотрудников университета

29-30 января 2014 года

ВИТЕБСК - 2014 г.

**УДК 616+615.1+378**
**ББК 5Я431+52.82я431**
**Д 70**

**Редактор:**
Профессор, доктор медицинских наук В.П. Дейкало
**Заместитель редактора**:
доцент, кандидат медицинских наук С.А. Сушков

**Редакционный совет:**
Профессор В.Я. Бекиш, профессор Г.Н. Бузук,
профессор С.Н. Занько, профессор В.И. Козловский,
профессор Н.Ю. Коневалова, д.п.н. З.С. Кунцевич,
д.м.н. Л.М. Немцов, профессор В.П. Подпалов,
профессор М.Г. Сачек, профессор В.М. Семенов,
доцент Ю.В. Алексеенко, доцент С.А. Кабанова,
доцент Л.Е. Криштопов, доцент С.П. Кулик,
ст. преп. Л.Н. Каныгина.

ISBN 978-985-466-694-5

Представленные в рецензируемом сборнике материалы посвящены проблемам биологии, медицины, фармации, организации здравоохранения, а также вопросам социально-гуманитарных наук, физической культуры и высшей школы. Включены статьи ведущих и молодых ученых ВГМУ и специалистов практического здравоохранения.

**УДК 616+615.1+378**
**ББК 5Я431+52.82я431**

ISBN 978-985-466-694-5

© УО “Витебский государственный медицинский университет”, 2014

Увеличение количества преподаваемых предметов, доли самостоятельной работы в учебной деятельности, появление новых забот, которые связаны с самообслуживанием и самостоятельным ведением бюджета, требует от первокурсника умения рационально планировать и организовывать своё учебное и свободное время. Данными умениями большинство первокурсников не обладает. Куратор может научить студентов эффективно планировать свой распорядок.

Опыт общения с первокурсниками показывает, что они не умеют записывать лекции, готовиться к семинарам, зачётам, экзаменам, организовывать самостоятельную работу. В связи с этим проводятся кураторские часы по следующим темам: «Золотые правила организации работы дня», «Готовимся к экзаменам», «Работа с конспектом».

Также куратору необходимо создать и поддержать в курируемой группе комфортную психологическую среду для успешной учебной и внеучебной деятельности студентов, для профессионального, личностного развития, содействовать становлению высокоинтеллектуальной, гармонично развитой личности. Для осуществления данной задачи кураторы групп тесно взаимодействуют с сотрудниками социально-педагогической и психологической службы, которые проводят практические занятия с элементами тренинга. После таких занятий куратор получает рекомендации по работе с курируемой группой первокурсников.

Особое место в организации работы куратора в нашем университете отведено проведению информационных часов, цель которых связана с разъяснением студентам стратегии государства в сфере политики, экономики, права, социальной защиты, образования, здравоохранения, культуры.

Использование государственной символики в воспитательной работе позволяет не только реализовать идеологическое направление в работе куратора, но и постепенно приобщает студентов курируемой группы к основам идеологии нашего государства, формирует чувство любви и уважения к Родине, гордости за её достижения, чувство ответственности за развитие и процветание. Всё это способствует патриотическому воспитанию студентов, его гражданскому становлению.

В воспитательной деятельности куратора уделяется особое внимание направлению, которое связано с формированием здорового образа жизни. Здоровый образ жизни студента – это система поведенческих стереотипов, способствующих сохранению и укреплению его здоровья. Большинство молодёжи увлекаются курением и спиртным. Одной из причин является ослабленный контроль со стороны взрослых, так как студенты большую часть времени проводят вне дома. В студенческом возрасте происходит знакомство с жизнью ночных клубов и дискотек, где имеются опасные соблазны.

Куратору студенческой группы необходимо также осуществлять воспитательную работу по профилактике и искоренению вредных привычек. Данное направление в воспитательной работе реализуется через проведение бесед о вреде курения, алкоголя; беседа на тему «В человеке всё должно быть прекрасным»; пропаганда физкультуры и спорта; информирование студентов о различных спортивных секциях в нашем университете. Куратор группы привлекает студентов к участию в таких мероприятиях, как День здоровья, акции за здоровый образ жизни в университете.

Воспитательная работа куратора академической группы 1 курса направлена на духовно-нравственное, интеллектуальное и физическое развитие студента, оказание помощи в адаптации к новым условиям, формирование сплочённого коллектива студенческой группы.

# АСОБАСНА-АРЫЕНТАВАНЫ ПАДЫХОД ПРЫ ВЫКЛАДАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ НА ФАКУЛЬТЭЦЕ ДАВУЗАЎСКАЙ ПАДРЫХТОЎКІ І ПРАФАРЫЕНТАЦЫІ

***Радзюк В.В***

*УО «Витебский государственный медицинский университет»*

Сучаснае інфармацыйнае грамадства патрабавальна ставіцца да спецыялістаў, тэндэнцыю да ўзрастання мае зацікаўленасць у супрацоўніках, якія могуць самастойна прымаць рашэнні, эфектыўна дзейнічаць, гнутка адаптавацца да ўмоў жыцця, быць канкурэнтнымі ў абранай прафесіі. Таму галоўны стратэгічны накірунак развіцця сучаснай адукацыі знаходзіцца на шляху вырашэння праблем у аспекце асобасна-арыентаванага навучання.

Асобасна-арыентаваны падыход у выкладанні – гэта канцэнтрацыя ўвагі педагога на асобе чалавека, клопат аб развіцці не толькі яго інтэлекту, але і духоўнасці,, эмацыянальных, эстэтычных, творчых магчымасцей. Як вядома, адной з мэт асобасна-арыентаванай адукацыі з'яўляецца развіццё здольнасці навучэнца да адказнасці за сваю ўласную пазіцыю, індывідуалізацыя (аўтаномнасць) асобы ад фактараў, якія ўплываюць на працэс навучання (засвоенасць матэрыялу, пазіцыя суседа па парце калектыўная пазіцыя ў групе і г.д). Таму асобасна-арыентаваная адукацыя прадугледжвае арыентацыю на працэс навучання з улікам індывідуальных асаблівасцей вучняў:

- узроставых, фізіялагічных, псіхалагічных і індывідуальных;
- адукацыйных запатрабаванасцей (таму вядучай з'яўляецца арыентаванасць на розны ўзровень складанасці праграмнага матэрыялу, які даступны навучэнцу);
- выдзяленне груп навучэнцаў згодна іх узроўню ведаў і здольнасцям;
- адносіны да кожнага вучня як унікальнай індывідуальнасці.

Такі накірунак у методыцы выкладання вылучае вучня (а не педагога) як галоўнага ўдзельніка працэсу навучання і, разам з тым, надае большую ролю выкладчыку як кіраўніку гэтага працэсу. Педагог робіцца не столькі крыніцай інфармацыі і кантралёрам, колькі дыягностам, карэктарам і памагатым у працэсе развіцця асобы.

Асобасна-арыентаваны падыход да выкладання беларускай мовы на факультэце давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі паспяхова ўкараняецца ў педагагічную практыку кафедры, паколькі:

1) мэтай навучання з'яўляецца не засваенне слухачамі новых ведаў, а карэкцыя і актуалізацыя ўжо атрыманых у працэсе навучання ў школе, таму працэс навучання на кафедры патрабуе індувідуалізацыі і карэкцыі;

2) школа стварала агульную адзіную і абавязковую лінію засвоенасці і развіцця пэўнага аб'ёму ведаў - падрыхтоўка да цэнтралізаванага тэсціравання павінна дапамагчы кожнаму слухачу ўдасканаліць свае індывідуальныя здольнасці з улікам таго вопыту, што ён ужо набыў;

3) вектар развіцця ведаў абітурыентаў ужо быў зададзены пры засваенні адпаведных дысцыплін у школе, а значыць выкладанне на занятках павінна забяспечыць усе неабходныя ўмовы для гэтага развіцця;

4) вектар развіцця індывідуальных асаблівасцей вучня ў школе будуецца ад навучання да вучэння, а на занятках – ад асобы вучня да вызначэння педагагічных методык і метадаў уздзеяння (тып задання, узровень яго складанасці, узровень яго індывідуалізацыі і г.д.);

5) прымяненне засвоеных ведаў на практыцы і выніковая іх эфектыўнасць павінна забяспечвацца асобасным ростам слухачоў (здольнасць да стратэгічнай дзейнасці ў стрэсавай сітуацыі ЦТ, крэатыўнасць і крытычнасць пры выкананні найбольш цяжкіх заданняў ЦТ).

Падрыхтоўка і правядзенне заняткаў выкладчыкамі кафедры ў аспекце асобасна-арыентаванага падыходу абапіраецца на вызначальныя накірункі:

1) зварот да суб'ектыўнага вопыту слухачоў – дыягнастычныя заданні тэставага характару, накіраваныя на абагульненне і сістэматызацыю сфарміраваных ведаў абітурыентаў;

2) прымяненне на занятках разнастайнага дыдактычнага матэрыялу – ад ужо створаных вучэбных комплексаў на кафедры да падрыхтаваных непасрэдна перад заняткамі з улікам дыягностыкі групавога ўзроўня ведаў, выкарыстанне выкладчыкам пры падрыхтоўцы да заняткаў розных крыніц інфармацыі (мінулагоднія матэрыялы ЦТ, матэрыялы рэпетыцыйнага тэставання, навейшыя дапаможнікі, слоўнікі і даведнікі), прапановы матэрыялу рознага тыпу, віду і формы, складанне алгарытмаў вырашэння лінгвістычнай праблемы, карткі з апісаннем асноўных вучэбных дзеянняў, камп'ютарныя тэхналогіі са своечасовым і пастаянным індывідуальным кантролем ведаў;

3) актывізацыя спосабаў вучэбнай работы – стымуляванне слухачоў да выкарыстання розных спосабаў і падыходаў да рашэння тэставага задання, аналіз і абмеркаванне розных падыходаў да задання, што дазваляе зрабіць навучэнцу індывідуальны выбар метаду адпаведна яго псіхічных якасцей як асобы, аналіз і карэкцыя дзеянняў кожнага слухача (правядзенне індывідуальных кансультацый і субяседаванняў, індывідуальная дыягностыка магчымасцей, выкарыстанне "электронных" картактэстаў), выяўленне тыповых памылак групы, агульназначымых спосабаў выканання заданняў і адпаведная карэкцыя выкладчыка сваёй дзейнасці на занятках, ацэньванне як самога працэсу навучання (падлік працэнтнай засвоенасці ведаў у рамках усёй праграмы, тэмы, яе падтэмы і мікратэмы, асобнага пытання), так і яго выніку (тэматычнае тэсціраванне рэпетыцыйнае тэсціраванне, вынік цэнтралізаванага тэсціравання), размеркаванне вучэбнага матэрыялу кожных заняткаў адпаведна тром узроўням – А (элементарныя базавыя веды па тэме), Б (сярэдняя ступень складанасці) і В (вышэйшы ўзровень складанасці), рэйтынгавая ацэнка ведаў, якая аптымізуе працэс навучання, дапамагае стварыць сітуацыю поспеху;

4) характар педагагічных зносін на занятках – паважнае і ўважлівае выслуханне навучэнца незалежна ад яго ўзроўню ведаў і паспяховасці, стымуляванне атмасферы "уключанасці" на занятках (эўрыстычныя метады, заахвочванне да своечасовых пытанняў на кожным этапе заняткаў – як зразумець умову задання, як выконваць умову задання, як пісаць словы, які знак прыпынку ставіць, як разумець значэнне слова і г.д., пастаноўка праблемы пошуку правільнага адказу, заахвочванне незалежнасці, індывідуальнасці і ўпэўненасці ў сваіх дзеяннях пры адказе, стварэнне сітуацыі, якая дазваляе кожнаму на занятках быць актыўным і самастойным, аказанне дапамогі тым, хто не паспявае за тэмпам заняткаў, падрабязная кансультацыя па выкананні дамашняга задання з тлумачэннем рацыянальнай арганізацыі вучэбнай работы).

Такім чынам, паколькі сутнасць асобасна-арыентаванага падыходу ў навучанні выяўляецца перш за ўсё ў комплексе акрэсленых метадычных, псіхолага-педагагічных і арганізацыйных мерапрыемстваў выкладчыка, эфектыўнай у дадзеным аспекце з'яўляецца тэхналогія ўзроўневай дыферэнцыяцыі навучальнага працэсу. Адзіным са шляхоў арганізацыі такога працэсу на кафедры з'яўляецца, на нашу думку, узроўневая дыферэнцыяцыя, дапоўненая кансультацыямі, заліковымі і экзаменацыйнымі тэстамі, якія адлюстроўваюць узровень засвоенасці ведаў слухачамі ў параўнанні з усімі групамі, тэматычным і рэпетыцыйным тэсціраваннем па дысцыпліне, арганізаваным на факультэце, што дэманструе поспехі слухачоў, напрыклад, дзённага аддзялення ў праўнанні са слухачамі вячэрняга і завочнага аддзяленняў, а таксама ў параўнанні з з прагназуемай колькасцю абітурыентаў, якія будуць здаваць цэнтралізаванае дзяржаўнае тэсціраванне па беларускай мове.